МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
Гістарычны факультэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі
______________ В.П. Кочын
17 студзеня 2025 г.
Рэгістрацыйны № 321-ВМ

Праграма ўступных выпрабаванняў
пры паступленні для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі

Спецыяльнасць 7-06-0222-03 Археалогія

Мінск, 2025

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

**Курловіч П. С.,** загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
**Касцюкевіч А. У.,** дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук

**РАЗГЛЕДЖАНА І РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін
Пратакол ад 11.12.2024 № 6

Загадчык кафедры ____________ П. С. Курловіч

Саветам гістарычнага факультэта
Пратакол ад 20.12.2024 № 4

Старшыня Савета ____________ А. Г. Каханоўскі

Адказны за рэдакцыю ____________ П. С. Курловіч

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступнага экзамена па спецыяльнасці 7-06-0222-03 Археалогія і метадычныя рэкамендацыі, складзеныя з улікам патрабаванняў да ўступных экзаменаў, якія ўстаноўленыя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Мэта і задачы ўступнага экзамена**

Мэтай уступнага экзамена з'яўляецца праверка ведаў паступаючага па найбольш значных пытаннях тэорыі і метадалогіі даследаванняў у археалогіі як гістарычнай навуковай дысцыпліны, а таксама па гісторыі і сучасным стане археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі.

Задачамі ўступнага экзамена з'яўляюцца:

– высвятленне адпаведнасці ўзроўню ведаў паступаючага да патрабаванняў навучання ў магістратуры;

– вызначэнне ступені тэарэтычнай падрыхтаванасці да вядзення палявых і аналітычных археалагічных даследаванняў;

– высвятленне здольнасці да арганізацыі самастойных навукова-даследчых археалагічных прац, а таксама напісання навуковых тэкстаў як канчатковага прадукту даследчай дзейнасці;

– вызначэнне гатоўнасці паступаючага да рашэння навуковых задач у адпаведнасці з прынцыпамі навуковай этыкі.

**Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі паступаючых:**

Для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ва УВА прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю.

Узровень асноўнай адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі – вышэйшая адукацыя, агульная вышэйшая ці спецыяльная вышэйшая адукацыя.

Праграма ўступнага экзамена накіравана на пацвярджэнне наяўнасці ў паступаючага неабходных для паспяховага засваення адукацыйнай праграмы магістратуры наступных кампетэнцый:

***універсальныя***:

УК-1 Прымяняць метады навуковага пазнання ў даследчай дзейнасці, генерыраваць і рэалізоўваць інавацыйныя ідэі;

УК-2 Вырашаць навукова-даследчыя і інавацыйныя задачы на аснове прымянення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

УК-3 Ажыццяўляць камунікацыі на замежнай мове ў акадэмічным, навуковым і прафесійным асяроддзі для рэалізацыі навукова-даследчай і прафесійнай дзейнасці;

УК-4 Забяспечваць камунікацыі, праяўляць лідарскія навыкі, быць здольным да камандаўтварэння і распрацоўкі стратэгічных мэт і задач;

УК-5 Развіваць інавацыйную ўспрымальнасць і здольнасць да інавацыйнай дзейнасці;

УК-6 Быць здольным да прагназавання ўмоў рэалізацыі прафесійнай дзейнасці і вырашэння прафесійных задач ва ўмовах нявызначанасці;

УК-7 Прымяняць псіхолага-педагагічныя метады і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў адукацыі і кіраванні.

***базавыя прафесійныя кампетэнцыі***:

БПК-1. Валодаць сучаснымі метадамі археалагічных даследаванняў;

БПК-2. Быць здольным да арганізацыі і правядзення самастойных палявых навукова-даследчых работ;

БПК-3. Ведаць патрабаванні да складання археалагічнай навукова-даследчай дакументацыі і ўмець выкарыстоўваць іх на практыцы;

БПК-4. Выкарыстоўваць у гісторыка-археалагічных даследаваннях тэматычныя сеткавыя рэсурсы, інфармацыйна-пошукавыя сістэмы, лічбавыя сродкі візуалізацыі вынікаў навуковай дзейнасці.

Змест праграмы мае комплексны, міждысцыплінарны характар і скіраваны на выяўленне ў паступаючых агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў ды ўменняў.

Паступаючы ў магістратуру па спецыяльнасці 7-06-0222-03 Археалогія павінен:

**ведаць**:

• асновы тэорыі і практыкі археалогіі як комплексу навуковых ведаў аб матэрыяльным, сацыяльна-палітычным і духоўным развіцці чалавецтва, якое рэканструюецца на падставе вывучэння рэшткаў яго матэрыяльнай культуры;

• асаблівасці археалагічнага даследавання ў рамках гістарычнай навукі, узаемадзеянне і сувязі з іншымі навуковымі галінамі;

• асноўныя этапы і асаблівасці гістарыяграфіі археалогіі Беларусі;

• сучасны стан і праблемныя пытанні археалагічнага вывучэння помнікаў розных эпох на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

• асноўныя канцэпцыі ў гісторыка-культурнай і этнічнай інтэрпрэтацыі носьбітаў археалагічных культур розных эпох на тэрыторыі Беларусі.

**умець:**

• ясна, поўна і аргументавана будаваць адказ на пытанні;

• крытычна падыходзіць да разгляду існуючых канцэпцый і тэорый археалагічнага даследавання;

• весці дыскусію па праблемах археалогіі Беларусі.

**валодаць:**

• тэрміналогіяй, якая выкарыстоўваецца ў археалогіі Усходняй Еўропы;

• асновамі методыкі палявога, тыпалагічнага і аналітычнага вывучэння археалагічных матэрыялаў;

• метадамі працы з археалагічнымі і пісьмовымі крыніцамі, якія выкарыстоўваюцца ў вывучэнні археалагічных матэрыялаў.

**Апісанне формы і працэдуры ўступнага экзамена**

Уступны экзамен з’яўляецца працэдурай конкурснага адбору і ўмовай прыёму на навучанне для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі.

Арганізацыя правядзення конкурсу і прыёму асоб для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі здзяйсняе прыёмная камісія ў адпаведнасці з Палажэннем аб прыёмнай камісіі ўстановы вышэйшай адукацыі і Правіламі прыёму асоб для атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі, зацверджанымі Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 01.09.2022 № 574.

Конкурсы на атрыманне паглыбленай вышэйшай адукацыі на вочнай, завочнай, дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі за кошт бюджэтных сродкаў і на платнай аснове праводзяцца асобна.

Уступныя экзамены праводзяцца згодна з раскладам, зацверджаным старшынёй прыёмнай камісіі БДУ.

Правядзенне ўступнага экзамена здзяйсняецца ў форме вуснага адказу, на беларускай альбо рускай мове.

Склад экзаменацыйнай камісіі зацвярджаецца загадам рэктара БДУ.

Пры правядзенні ўступнага экзамена ў вуснай форме час падрыхтоўкі абітурыента да адказу складае не менш чым 30 хвілін і не павінен перавышаць 90 хвілін, а працягласць адказу не больш чым 15 хвілін. Для ўдакладнення экзаменацыйнай адзнакі абітурыенту могуць быць зададзены дадатковыя пытанні ў адпаведнасці з праграмай уступнага выпрабавання.

Ацэнка ведаў асоб, якія паступаюць ў магістратуру здзяйсняецца па дзесяцібальнай шкале, станоўчай з’яўляецца адзнака не ніжэй «шасці».

Пры правядзенні ўступнага экзамена ў вуснай форме экзаменацыйная адзнака аб’яўляецца адразу пасля завяршэння апытання абітурыента.

**Характарыстыка структуры экзаменацыйнага білета**

Экзаменацыйны білет складаецца з уступных пытанняў па вучэбнай дысцыпліне «Археалогія».

Экзаменацыйны білет складаецца з трох тэарэтычных пытанняў, якія дазваляюць ацаніць атрыманыя ў працэсе навучання на I ступені вышэйшай адукацыі (адукацыйная праграма бакалаўрыяту), веды і практычныя навыкі.

Крытэр**ыі ацэньвання адказу на ўступным экзамене.**

Пры ацэнцы адказу ўлічваюцца наступныя параметры:

10 балаў

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах праграмы ўступнага іспыту, а таксама па пытаннях, якія выходзяць за іх межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай археалагічнай тэрміналогіі, стылістычна пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета;

бездакорнае валоданне археалагічным інструментарыем, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па археалогіі, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту;

уменне свабодна арыентавацца ў археалагічных тэорыях, канцэпцыях і накірунках, даваць ім крытычную ацэнку, разумець сутнасць гісторыка-культурных працэсаў;

выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых навук.

9 балаў

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах праграмы ўступнага іспыту;

дакладнае выкарыстанне навуковай археалагічнай тэрміналогіі, стылістычна пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета;

валоданне археалагічным інструментарыем, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах праграмы ўступнага іспыту;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па археалогіі, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту;

уменне арыентавацца ў археалагічных тэорыях, канцэпцыях і накірунках, даваць ім аналітычную ацэнку, разумець сутнасць гісторыка-культурных працэсаў.

8 балаў

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах праграмы ўступнага іспыту;

дакладнае выкарыстанне навуковай археалагічнай тэрміналогіі, пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета;

валоданне археалагічным інструментарыем, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах праграмы ўступнага іспыту;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па археалогіі, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту;

уменне арыентавацца ў археалагічных тэорыях, канцэпцыях і накірунках, даваць ім аналітычную ацэнку, разумець сутнасць гісторыка-культурных працэсаў.

7 балаў

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах праграмы ўступнага іспыту;

выкарыстанне навуковай археалагічнай тэрміналогіі, пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне археалагічным інструментарыем, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

свабоднае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках праграмы;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па археалогіі, рэкамендаванай праграмай ўступнага іспыту;

уменне арыентавацца ў асноўных археалагічных тэорыях, канцэпцыях і накірунках, даваць ім аналітычную ацэнку, арыентавацца ў гісторыка-культурных працэсах.

6 балаў

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме праграмы ўступнага іспыту;

выкарыстанне неабходнай навуковай археалагічнай тэрміналогіі, пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне археалагічным інструментарыем, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыповыя рашэнні ў рамках праграмы ўступнага іспыту;

засваенне асноўнай літаратуры па археалогіі, рэкамендаванай праграмай ўступнага іспыту;

уменне арыентавацца ў базавых археалагічных тэорыях, канцэпцыях і накірунках, даваць ім параўнальную ацэнку, арыентавацца ў гісторыка-культурных працэсах.

5 балаў

дастатковыя веды ў аб'ёме праграмы ўступнага экзамена;

выкарыстанне навуковай археалагічнай тэрміналогіі, пісьменнае, лагічна правільнае выкладанне адказаў на пытанні білета, уменне рабіць высновы;

валоданне археалагічным інструментарыем, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыповыя рашэнні ў рамках праграмы ўступнага іспыту;

засваенне асноўнай літаратуры па археалогіі, рэкамендаванай праграмай уступнага іспыту; уменне арыентавацца ў базавых археалагічных тэорыях, канцэпцыях і накірунках і даваць ім параўнальную ацэнку.

4 балы

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры па археалогіі, рэкамендаванай праграмай ўступнага іспыту;

выкарыстанне навуковай археалагічнай тэрміналогіі, лагічнае выкладанне адказаў на пытанні білета, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне базавым археалагічным інструментарыем, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне арыентавацца ў асноўных археалагічных тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вучэбных дысцыплінах і даваць ім ацэнку.

3 балы

недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры па археалогіі, рэкамендаванай праграмай ўступнага іспыту;

выкарыстанне навуковай археалагічнай тэрміналогіі, выклад адказаў на пытанні білета з істотнымі лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне археалагічным інструментарыем;

некампетэнтнасць ў вырашэнні стандартных (тыпавых) археалагічных задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных археалагічных тэорыях, канцэпцыях і кірунках.

2 балы

фрагментарныя веды ў межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне асобных літаратурных крыніц па археалогіі, рэкамендаваных праграмай ўступнага экзамена;

няўменне выкарыстоўваць навуковую археалагічную тэрміналогію, наяўнасць у адказе грубых лагічных памылак.

1 бал

адсутнасць ведаў і кампетэнцый ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

адмова ад адказу;

нняўка на ўступны экзамен без уважлівай прычыны.

# ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

## Раздзел 1. Тэорыя і метадалогія археалагічнага даследавання. Гістарыяграфія археалогіі Беларусі

**Тэма 1.1.**
*Базавыя паняцці ў археалогіі*

Прадмет і задачы археалогіі. Месца археалогіі у сістэме навук. Археалагічная спецыялізацыя і праблема адзінства археалогіі.

Паняцце "археалагічная крыніца". Гістарычная інфармацыя ў археалагічных крыніцах. Класіфікацыі археалагічных крыніц.

Паняцце "археалагічная культура". Крытэрыі вылучэння археалагічных культур. Праблема аб'ёма паняцця "археалагічная культура". Праблема статуса археалагічнай культуры. Археалагічная культура і этнас.

**Тэма 1.2.**
*Перыядызацыя, храналогія і метады датавання ў археалогіі*

Археалагічная перыядызацыя і храналогія. Метады абсалютнага і адноснага датавання. Тыпалагічны метад. Варвахраналогія. Стратыграфічны метад. Паняцце "адкрытага" і "закрытага" комплексу. Датыроўка па пісьмовых крыніцах. Датыроўка па манетах. Дэндрахраналагічны метад. Радыёвугляродны метад. Метад паскаральнай мас-спектраметрыі. Тэрмалюмінісцэнтны метад. Археамагнітнае датаванне. Каліева-аргонавы метад.

**Тэма 1.3.**
*Апрацоўка археалагічных матэрыялаў*

Камеральная апрацоўка матэрыялаў. Паняцці "рэстаўрацыя" і "кансеравацыя". Ідэнтыфікацыя сыравіны, з якой выраблены археалагічныя находкі. Вывучэнне тэхналогіі старажытнай вытворчасці. Вызначэнне функцыянальнага прызначэння рэчаў. Класіфікацыя і тыпалогія ў археалогіі.

**Тэма 1.4.**
*Методыка палявых археалагічных даследаванняў*

Прынцыпы палявых археалагічных даследаванняў. Археалагічныя разведкі. Методыка вывучэння неўмацаваных паселішчаў. Методыка вывучэння ўмацаваных паселішчаў. Методыка вывучэння пахавальных комплексаў. Асаблівасці гарадской археалогіі. Палявая дакументацыя. Комплексныя і міждысцыплінарныя палявыя археалагічныя даследаванні. Неінвазіўныя метады ў археалагічных даследаваннях.

**Тэма 1.5.**
*Станаўленне археалагічнай навукі на тэрыторыі Беларусі*

Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVIII–пачатку XX ст. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1917–1941 гг. Навуковая дзейнасць К. М. Палікарповіча. Навуковая дзейнасць А. М. Ляўданскага. Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

**Тэма 1.6.**
*Асноўныя накірункі археалагічных даследаванняў каменнага і бронзавага вякоў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст.*

Вывучэнне помнікаў палеаліту ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Вывучэнне помнікаў мезаліту ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Вывучэнне помнікаў неаліту ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Вывучэнне старажытнасцей бронзавага веку ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Археалогія Беларусі на сучасным этапе: праблемы і перспектывы.

**Тэма 1.7.**
*Асноўныя накірункі археалагічных даследаванняў жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст.*

Вывучэнне старажытнасцей ранняга жалезнага веку на тэрыторыі паўднёвай Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Вывучэнне старажытнасцей жалезнага веку на тэрыторыі паўночнай Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Вывучэнне старажытнасцей рымскага часу і эпохі Вялікага перасялення народаў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Раннеславянская археалогія. Археалогія Беларусі на сучасным этапе: праблемы і перспектывы. Праблемы этнічнай гісторыі ў працах археолагаў.

**Тэма 1.8.**
*Асноўныя накірункі археалагічных даследаванняў сярэдніх вякоў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст.*

Вывучэнне помнікаў ранняга сярэдневякоўя ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Вывучэнне курганных старажытнасцей. Вывучэнне помнікаў старажытнарускага часу. Вывучэнне помнікаў позняга сярэднявечча – ранняга Новага часу ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Вывучэнне замкаў. Археалогія Беларусі на сучасным этапе: праблемы і перспектывы. Пытанні гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

## Раздзел 2. Каменны век Беларусі

**Тэма 2.1.**
*Сярэдні і позні палеаліт на тэрыторыі Беларусі*

Перыядызацыі і храналогія палеаліту. Палеагеаграфія эпохі.

Праблема першапачатковага засялення тэрыторыі Беларусі. Помнікі, час, асноўныя шляхі.

Позні (верхні) палеаліт. Асноўныя помнікі. Гісторыя іх вывучэння і даследавання. Пытанні храналогіі і культурнай інтэрпрэтацыі. Асаблівасці матэрыяльнай культуры старажытнага насельніцтва тэрыторыі Беларусі.

**Тэма 2.2.**
*Фінальны палеаліт на тэрыторыі Беларусі*

Праблемы перыядызацыі і храналогіі. Палеагеаграфія эпохі.

Агульная характарыстыка фінальнапалеалітычнага часу. Асноўныя тыпы паселішчаў і асаблівасці іх тапаграфіі. Характэрныя рысы матэрыяльнай культуры насельніцтва. Характарыстыка гаспадарчых заняткаў першабытных супольнасцяў.

Асноўныя накірункі засялення тэрыторыі Беларусі ў фінальным палеаліце. Культурная сітуацыя ў эпоху фінальнага палеаліту на тэрыторыі Беларусі. Знаходкі гамбургскай культуры. Лінгбійская культура. Валкушанская культура. Свідэрская культура. Грэнская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу насельніцтва.

**Тэма 2.3.**
*Мезаліт на тэрыторыі Беларусі*

Храналогія і перыядызацыя. Асаблівасці палеагеаграфіі галацэна Беларусі.

Агульная характарыстыка эпохі мезаліту. Асноўныя тыпы паселішчаў і асаблівасці іх тапаграфіі. Характэрныя рысы матэрыяльнай культуры насельніцтва. Характарыстыка гаспадарчых заняткаў першабытных супольнасцяў. Духоўная культура чалавека эпохі мезаліту.

Культурная сітуацыя ў эпоху мезаліту на тэрыторыі Беларусі.

Кундская культура. Бутаўская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу насельніцтва.

Кудлаеўская культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі.

Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу насельніцтва.

Яніславіцкая культура. Гісторыя вывучэння і даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Тэрыторыя распаўсюджання. Асноўныя помнікі. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Праблемы генезісу і гістарычнага лёсу насельніцтва.

**Тэма 2.4.**
*Неаліт на тэрыторыі Беларусі. Агульная характарыстыка эпохі.*

Праблемы храналогіі і перыядызацыі. Палеагеаграфія сярэдняга галацэну Беларусі.

Агульная характарыстыка эпохі. Тэхналагічныя навацыі неалітычнай эпохі. Асноўныя тыпы паселішчаў і асаблівасці іх тапаграфіі. Характэрныя рысы матэрыяльнай культуры насельніцтва. Характарыстыка гаспадарчых заняткаў людзей. Духоўная культура неалітычных супольнасцяў.

Паняцці “лясны неаліт” і “цэнтральнаеўрапейскі неаліт”.

**Тэма 2.5.**
*Культуры “ляснога неаліту” на тэрыторыі Заходняй Беларусі.*

Прыпяцка-нёманская і нёманская культуры. Гісторыя вывучэння. Арэал. Праблемы вылучэння лакальных варыянтаў. Асноўныя помнікі. Матэрыяльная культура насельніцтва. Кераміка. Крамянёвы інвентар. Пытанні храналогіі і перыядызацыі. Праблемы генезісу. Гістарычныя лёсы насельніцтва.

**Тэма 2.6.**
*Культуры “ляснога неаліту” на тэрыторыі Усходняй Беларусі.*

Днепра-данецкая культура. Верхнедняпроўская культура. Гісторыя вывучэння. Арэал. Праблемы вылучэння лакальных варыянтаў. Асноўныя помнікі. Матэрыяльная культура насельніцтва. Кераміка. Крамянёвы інвентар. Пытанні храналогіі і перыядызацыі. Праблемы генезісу. Гістарычныя лёсы насельніцтва.

**Тэма 2.7.**
*Культуры “ляснога неаліту” на тэрыторыі Паўночнай і Паўночна-Заходняй Беларусі.*

Культуры “ляснога неаліту” на тэрыторыі Паўночнай і Паўночна-Заходняй Беларусі. Нарвенская культура. Культура тыповай грабеньчата — ямкавай керамікі. Усвяцкая культура. Гісторыя вывучэння. Арэал. Асноўныя помнікі. Матэрыяльная культура насельніцтва. Кераміка. Крамянёвы інвентар. Пытанні храналогіі і перыядызацыі. Праблемы генезісу. Гістарычныя лёсы насельніцтва.

**Тэма 2.8.**

*Культуры “цэнтральнаеўрапейскага неаліту” на тэрыторыі Беларусі.*

Культура шарападобных амфар. Гісторыя вывучэння. Арэал. Асноўныя помнікі. Матэрыяльная культура насельніцтва. Кераміка. Крамянёвы інвентар. Пахавальная абраднасць. Пытанні храналогіі і перыядызацыі. Асноўныя шляхі і механізмы распаўсюджання. Гістарычныя лёсы насельніцтва.

## Раздзел 3. Бронзавы век Беларусі

**Тэма 3.1.**

*Бронзавы век. Агульная характарыстыка эпохі*

Паняцце “бронзавы век”. Праблемы крытэрыяў вылучэння эпохі бронзавага веку. Месца бронзавага веку ў археалагічнай сістэме “трох вякоў”. Асаблівасці эпохі бронзы на тэрыторыі Беларусі. Еўрапейскія сістэмы перыядызацыі і храналогіі бронзавага веку. Праблемы перыядызацыі і храналогіі бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі. Эканамічная, сацыяльная і культурная ролі ранніх металаў.

**Тэма 3.2.**

*Кола культуры шнуравой керамікі на тэрыторыі Беларусі*

Асноўныя прыкметы кола культуры шнуравой керамікі. Элементы “старашнуравога гарызонта” (“А-гарызонта”) на тэрыторыі Беларусі. Сярэднедняпроўская культура. Помнікі кола культуры шнуравой керамікі на Панямонні. Помнікі кола культуры шнуравой керамікі на Заходнім Палессі. Гісторыя вывучэння. Арэал. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Гаспадарчая дзейнасць носьбітаў. Праблемы рэканструкцыі духоўнай культуры насельніцтва. Праблемы храналогіі і перыядызацыі. Праблемы генезісу. Гістарычныя лёсы насельніцтва.

**Тэма 3.3.**

*Паўночнабеларуская культура*

Гісторыя вывучэння. Арэал. Асноўныя паселішчы і могільнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Гаспадарчая дзейнасць носьбітаў. Праблемы рэканструкцыі духоўнай культуры насельніцтва. Праблемы храналогіі і перыядызацыі. Праблемы генезісу. Гістарычныя лёсы насельніцтва.

**Тэма 3.4.**
*Помнікі тшцінецкага культурнага кола на тэрыторыі Беларусі*

Гісторыя даследавання. Праблема вылучэння лакальных культур (груп) помнікаў. Храналогія і перыядызацыя. Асноўныя помнікі. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Гаспадарчая дзейнасць носьбітаў. Праблемы рэканструкцыі духоўнай культуры насельніцтва. Праблемы генезісу. Гістарычныя лёсы насельніцтва.

**Тэма 3.5.**
*Культура шматвалікавай керамікі на тэрыторыі Беларусі.*

Гісторыя вывучэння. Матэрыялы культуры шматвалікавай керамікі на тэрыторыі Беларусі. Арэал. Паселішчы. Пахаванні. Асаблівасці матэрыяльнай культуры. Праблемы датавання. Асноўныя падыходы да вызначэння шляхоў і механізмаў распаўсюджання культуры шматвалікавай керамікі на тэрыторыі Беларусі.

**Тэма 3.6.**
*Позні бронзавы век на тэрыторыі Беларусі*

Праблемы вылучэння позняга этапу бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі. Праблемы храналогіі і перыядызацыі. Комплексы лебядоўскага (позняга сосніцкага) тыпу. Прыбарскі курганны могільнік. Помнікі тыпу Нача. Позні этап бронзавага веку на Паазер'і. Распаўсюджанне комплексаў з тэкстыльнай і штрыхаванай керамікай. Праблемы вывучэння гаспадарчай дзейнасці чалавека ў познім бронзавым веку на тэрыторыі Беларусі. Перспектывы рэканструкцыі светапоглядных уяўленняў насельніцтва.

## Раздзел 4. Жалезны век і эпоха Вялікага перасялення народаў на тэрыторыі Беларусі

**Тэма 4.1.**
*Агульная характарыстыка жалезнага веку*

Перыядызацыя і храналогія жалезнага веку Цэнтральнай Еўропы. Жалезны век лясной зоны Усходняй Еўропы (ранні жалезны век, рымскі час, эпоха Вялікага перасялення народаў). Асаблівасці ды этапы гаспадарчага і гісторыка-культурнага развіцця рэгіёнаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Пісьмовыя крыніцы да вывучэння праблем гістарычнага і этнічнага развіцця насельніцтва жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі.

**Тэма 4.2.**
*Мілаградская культура*

Гісторыя вывучэння. Храналогія, праблема вызначэння арэалу культуры. Асаблівасці пахавальнага абраду. Гаспадарчы лад насельніцтва. Характарыстыка матэрыяльнай культуры. Праблема гістарычнай інтэрпрэтацыі і этнічнай прыналежнасці носьбітаў. Паходжанне і праблема гістарычнага лёсу насельніцтва мілаградскай культуры.

**Тэма 4.3.**
*Помнікі паморскай культуры на тэрыторыі Беларусі*

Храналогія, агульны арэал. Характарыстыка паселішчаў і пахавальных помнікаў, матэрыяльная культура. Генезіс паморскай культуры, асаблівасці яе падклёшавага варыянту і зоны распаўсюджання помнікаў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Гісторыя вывучэння паморска-падклёшавых помнікаў у беларускай археалогіі, іх агульная характарыстыка. Праблема этнічнай прыналежнасці і гістарычнага лёсу насельніцтва.

**Тэма 4.3.**
*Зарубінецкая культура*

Месца зарубінецкай культуры ў коле латэнізаваных культур Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Гістарыяграфія вывучэння на тэрыторыі Беларусі. Агульная характарыстыка помнікаў: арэал, паселішчы, могільнікі, характар матэрыяльнай культуры. Асаблівасці палескага і верхнядняпроўскага (тыпу Чаплін і Кісцяні-Чачэрск) варыянтаў культуры. Праблемы генезісу і храналогіі. Гісторыка-культурная і этнічная інтэрпрэтацыя.

**Тэма 4.4.**
*Культуры штрыхаванай керамікі*

Гістарыяграфія вывучэння культур ранняй і позняй штрыхаванай керамікі. Храналагічныя рамкі культур. Дынаміка і агульны арэал рассялення носьбітаў. Параўнаўчая характарыстыка культур ранняй і позняй штрыхаванай керамікі: гаспадарчы лад, паселішчы, жытлы, матэрыяльная культура, праблема вывучэння пахавальнага абраду. Паходжанне і гістарычны лёс насельніцтва, праблема вызначэння яго этнічнай прыналежнасці.

**Тэма 4.5.**
*Днепра-дзвінская культура*

Гістарыяграфія вывучэння. Храналогія, тэрыторыя распаўсюджання і лакальныя варыянты. Сувязі з суседнімі культурамі. Характарыстыка

паселішчаў і жытлаў. Гаспадарчая дзейнасць і матэрыяльная культура. Паходжанне і гістарычны лёс насельніцтва. Вызначэнне этнічнай прыналежнасці насельніцтва.

**Тэма 4.6.**
*Помнікі постзарубінецкага гарызонту і кіеўская культура*

Гістарыяграфія вывучэння. Прычыны распаду зарубінецкай культуры і фарміравання гарызонту постзарубінецкіх помнікаў. Агульная характарыстыка апошніх: храналогія, арэал, домабудаўніцтва, пахавальны абрад, асаблівасці матэрыяльнай культуры. Помнікі постзарубінецкага гарызонту на тэрыторыі Беларусі. Кіеўская культурная агульнасць і яе верхнедняпроўскі варыянт: агульная характарыстыка. Гістарычная і этнічная інтэрпрэтацыя насельніцтва постзарубінецкага гарызонту і кіеўскай культуры. Роля насельніцтва апошняй ў фарміраванні культур раннегістарычных славянскіх плямёнаў.

**Тэма 4.7.**
*Культуры "гоцкага" кола: вельбарская, чарняхоўская*

Агульная характарыстыка вельбарскай культуры: храналогія, генезіс, змены арэалу, гаспадарчы лад, паселішчы, пахавальны абрад. Сацыяльна-палітычная арганізацыя насельніцтва. Гістарыяграфія і сучасны стан вывучэння помнікаў вельбарскай культуры на тэрыторыі Беларусі. Гістарычная інтэрпрэтацыя і этнічная прыналежнасць насельніцтва.

Агульная характарыстыка чарняхоўскай культуры: арэал, храналогія, паселішчы і жытлы, могільнікі, рэчавы комплекс. Гаспадарчы лад і сацыяльная арганізацыя насельніцтва. Праблемы генезісу і этнічнай прыналежнасці носьбітаў.

**Тэма 4.8.**
*Пражская культура*

Гісторыя вывучэння і фарміравання паняцця пражскай культуры. Храналогія, арэал, гістарычная і этнічная прыналежнасць насельніцтва. Агульная характарыстыка: паселішчы, жылыя і гаспадарчыя пабудовы, пахавальны абрад, характарыстыка керамічнага і рэчавага комплексу. Сучасныя ўяўленні аб накірунках рассялення раннегістарычных славян. Помнікі тыпу Іпацешці-Кундзешці-Чурэл і Сукаў-Дзедзіцэ. Характарыстыка помнікаў пражскай культуры на Беларускім Палессі. Праблемы фарміравання і гісторыка-культурнага лёсу насельніцтва.

**Тэма 4.9.**
*Калочынская культура*

Агульная характарыстыка культуры: храналогія, арэал, тыпы помнікаў, асаблівасці домабудаўніцтва, пахавальны абрад, матэрыяльная культура. Гаспадарчы лад і сацыяльная структура насельніцтва. Гісторыя вывучэння на тэрыторыі Беларусі. Спецыфіка калочынскай культуры ў коле "раннеславянскіх" культур эпохі Вялікага перасялення народаў. Генезіс і этнічная інтэрпрэтацыя. Гісторыка-культурны лёс насельніцтва.

**Тэма 4.10.**
*Банцараўская культура*

Гісторыя вывучэння. Агульная характарыстыка культуры: храналогія, арэал, тыпы помнікаў, асаблівасці домабудаўніцтва, пахавальны абрад, матэрыяльная культура. Гаспадарчы лад і сацыяльная структура насельніцтва. Генезіс, этнічная інтэрпрэтацыя і гісторыка-культурны лёс насельніцтва.

**Тэма 4.11.**
*Культура пскоўскіх доўгіх курганоў*

Гісторыя вывучэння. Агульная характарыстыка культуры: храналогія, арэал, могільнікі і пахавальны абрад, паселішчы, рэчавы комплекс. Генезіс, праблемы этнічнай інтэрпрэтацыі. Гісторыка-культурны лёс насельніцтва.

## Раздзел 5. Археалогія Беларусі IX – XIII стст.

**Тэма 5.1.**
*Культура смаленска-полацкіх доўгіх курганоў*

Гісторыя вывучэння. Агульная характарыстыка культуры (арэал, храналогія, паселішчы, могільнікі і пахавальных абрад, рэчавы комплекс). Праблема генезісу культуры і яе этнічнай інтэрпрэтацыі. Летапісныя крывічы. Гістарычны лёс насельніцтва.

**Тэма 5.2.**
*Райкавецкая (лука-райкавецкая) культура*

Гісторыя вывучэння. Агульная характарыстыка культуры (арэал, храналогія, паселішчы, могільнікі і пахавальных абрад, рэчавы комплекс). Генезіс культуры і яе этнічная інтэрпрэтацыя. Гістарычны лёс насельніцтва.

**Тэма 5.3.**
*Балцкія культуры на тэрыторыі Заходняй Беларусі*

Культура ўсходнелітоўскіх курганоў. Гісторыя даследавання. Храналогія і перыядызацыя. Арэал. Характарыстыка помнікаў. Пахавальны абрад. Кантакты з суседнімі культурамі. Гістарычны лёс насельніцтва.

**Тэма 5.4.**
*Сельскія паселішчы IX–XIII стст.*

Тапаграфія сельскіх паселішчаў і іх памеры. Тып забудовы, асноўныя віды жылых і гаспадарчых пабудоў. Земляробства і жывёлагадоўля, вясковае рамяство. Пахавальныя помнікі. Феадальныя замкі. Прыкметы феадальных замкаў у матэрыяльнай культуры. Вішчынскі замак.

**Тэма 5.5.**
*Гарады Полацкай зямлі*

Тапаграфічная структура і матэрыяльная культура. Этапы вывучэння і асноўныя даследчыкі. Роля і месца Полацка ў беларускай археалогіі. Элементы тапаграфічнай структуры горада IX–XVII стст.: замкі, пасады, манастыры (тэрыторыя, храналогія, культурны слой). Старажытны Мінск. Праблема месцазнаходжання старажытнага Мінска. Тапаграфія і абарончыя збудаванні. Планіроўка і забудова. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Мінскі храм. Гандаль і залатарства, рамяство і сельская гаспадарка. Горад і акруга.

**Тэма 5.6.**
*Гарады Паўднёвай Беларусі*

Асноўныя археолагі-даследчыкі. Гісторыя вывучэння Турава і Брэста. Асаблівасці тапаграфіі, характарыстыка культурных напластаванняў. Забудова: драўляная і манументальная. Тапаграфія і планіроўка гарадоў: Пінска, Берасця, Давыд-Гарадка, Слуцка, Клецка, Рагачова і інш. Абарончыя ўмацаванні, заняткі насельніцтва. Гандлёвыя і культурныя сувязі з іншымі землямі.

**Тэма 5.7.**
*Гарады Беларускага Панямоння (Гродна, Наваградак, Ваўкавыск)*

Асноўныя даследчыкі. Тапаграфія, абарончыя збудаванні, забудова. Помнікі манументальнага дойлідства: пералік, характарыстыка, вытокі. Культурныя і гандлёвыя сувязі з паўночнымі і паўднёвымі краінамі па матэрыялах археалагічных раскопак. Матэрыяльная культура насельніцтва.

## Раздзел 6. Археалогія позняга сярэднявечча – ранняга Новага часу

**Тэма 6.1.**
*Побытавая, масавая забудова і планіроўка ў гарадах Беларусі XIV–XVIII стст.*

Крыніцы па побытавой і масавай забудове, планіроўцы гарадоў XIV–XVIII стст. Даныя археалогіі, картаграфіі, пісьмовых крыніц. Змены ў гарадской тапаграфіі і іх прычыны. Гарадскія ўмацаванні. Культавыя і грамадскія пабудовы ў структуры беларускага горада XIV–XVIII стст. Тыпы жылых і гаспадарчых пабудоў. Элементы домабудаўніцтва. Камунальныя збудаванні на тэрыторыі беларускіх гарадоў.

**Тэма 6.2.**
*Замкі XIV–XVIII стст. у Беларусі*

Асноўныя даследчыкі, гісторыя вывучэння замкаў на тэрыторыі Беларусі. Эвалюцыя паняцця замак ў XIV–XVIII стст. Тыпы замкаў. Храналогія замкаў. Замкі драўляныя і мураваныя. Замкі-кастэлі. Канвентхаўзы. Замкі-крэпасці. Замкі-палацы. Фартэцыі. Арганізацыя абароны ў замках. Матэрыяльная культура замкаў і яе асаблівасці.

**Тэма 6.3.**
*Археалагічнае вывучэнне манументальнага дойлідства ў Беларусі*

Архітэктура абарончых аб’ектаў і яе вывучэнне. Літаратура і даследчыкі. Гарадскія культавыя аб’екты ў Полацку, Віцебску, Гродна, Тураве, Мінску і іншых гарадах. Манастырскія комплексы ў буйных гарадах і мястэчках. Помнікі грамадскага дойлідства. Фарміраванне структуры цэнтра гарадоў у XVI–XVIII стст.

**Тэма 6.4.**
*Паселішчы XIV – XVIII стст. на тэрыторыі Беларусі ў сельскай мясцовасці*

Віды помнікаў. Гісторыя вывучэння і ступень даследаванасці. Феадальныя сядзібы. Мястэчкі. Тыпы мястэчкаў. Шляхі ўзнікненні мястэчак і іх далейшае развіццё. Змены ў рассяленні вясковага насельніцтва. Тыпы паселішчаў сялян. Планіроўка і забудова помнікаў. Асноўныя заняткі насельніцтва. Асаблівасці матэрыяльнай культуры.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Асноўная літаратура:

1. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі. – Мн.: Беларуская навука, 1997.
2. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 2. Жалезны век і ранняе сярэднявечча. – Мн.: Беларуская навука, 1999.
3. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 3. Сярэдневяковы перыяд: IX–XIII ст. – Мн.: Беларуская навука, 2000.
4. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII ст. – Мн.: Беларуская навука, 2001.
5. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1 / Рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2009. – 496 с.
6. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2 / Рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2011. – 464 с.
7. Археология: Учебник / Под редакцией академика РАН В.Л. Янина. — М.: Изд-во Моск. ун-та, 2006. — 608 с.
8. Інструкцыя аб парадку правядзення археалагічных даследаванняў і вядзення палявой дакументацыі пры іх правядзенні (ад 23.12.2016).
9. Классификация в археологии / Отв. ред. Колпаков Е. М. СПб.: ИИМК РАН, 2013. – 248 с.
10. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З
11. Колосов, А. В. Основы археологии: учеб.-метод. пособие / А. В. Колосов. — Могилев: УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2012. — 160 с.
12. Мартынов А.И., Шер А.Я. Методы археологического исследования. М., 1989.
13. Чарняўскі М.М. Каменны век Беларусі: ілюстраваны канспект лекцый. - Мінск: Тэхналогія, 2011.

### Дадатковая літаратура:

14. Авдусин Д.А. Полевая археология СССР. М., 1980.
15. Алексеев Л.В. Археология и краеведение Беларуси. XVI в. – 30-е годы XX в. Мн., 1996.
16. Артеменко, И.И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы. – М.: Наука, 1967.
17. Артеменко И.И. Среднеднепровская культура. Сосницкая культура. Тшцинецкая культура // Эпоха бронзы лесной полосы СССР. М., 1987.
18. Археологическое наследие Беларуси = Archaeological Heritage of Belarus. Минск, 2012.
19. Белорусская археология: Достижения археологов за годы Советской власти. Мн., 1987.
20. Бубенько Т.С. Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок. Витебск, 2004.

21. Буршнева С.Г. Реставрация археологических и этнографических предметов из железа: учеб.-метод. пособие / С.Г. Буршнева. – Казань: Изд-во Казан. ун-та, 2019. – 88 с
22. Воронин Н.Н. Древнее Гродно // МИА. М., 1954. № 41.
23. Восточная Европа в середине I тыс. н.э. //Раннеславянский мир. Археология славян и их соседей. Вып. 9. М., 2007.
24. Вяргей В.С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР. 1919 – 1941 гг. Мн., 1992.
25. Гуревич Ф.Д. Древний Новогрудок: Посад – окольный город. Л., 1981.
26. Гурина Н.Н. Древние кремнедобывающие шахты на территории СССР. Л., 1976.
27. Друцк: Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX–XII вв., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владельцы в XIII–XVIII вв., ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники архитектуры и объекты туризма. – Минск: Беларуская навука, 2014.
28. Дук Д. У. Археалагічныя комплексы пасадаў Полацка IX—XVIII стст. (па выніках раскопак 2004—2012 гг.). — Наваполацк: ПДУ, 2014.
29. Дук Д. У. Полацк XVI—XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада. — Наваполацк: ПДУ, 2007
30. Дук Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.). – Наваполацк: ПДУ, 2010.
31. Егорейченко А.А. Культуры штрихованной керамики. Мн., 2006.
32. Загарульскі Э.М. Заходняя Русь IX–XIII стст. Мн., 1998.
33. Загорульский Э.М. Белая Русь с середины I тысячелетия до середины XIII века. – Мн.: «Четыре четверти», 2012 (2014).
34. Загорульский Э.М. Вищинский замок XII–XIII вв. Мн., 2003.
35. Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Мн. 1982.
36. Зверуго Я.Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. Мн., 1989.
37. Исаенко В.Ф. Неолит Припятского Полесья. Мн., 1976.
38. Іоў, А.В. Старажытнае паселішча на Ясельдзе / А.В.Іоў, В.С.Вяргей. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – 175 с.
39. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.]; отв. ред. тома: О. Н. Левко, В. Ф. Голубев; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. — Минск: Беларуская навука, 2018. — 598 с.
40. Калечиц Е. Г. Первоначальное заселение территории Белоруссии. Мн., 1984.
41. Калечиц Е.Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии. Мн., 1987.
42. Калечиц Е.Г. Человек и среда обитания. Восточная Беларусь. Каменный век. – Мн., 2003.

43. Калечыц, Е.Г., Коласаў, А.У., Абухоўскі, В.С. Палеалітычныя помнікі Беларусі. Культурна-храналагічная дыферэнцыацыя крыніц. Мінск: Бел.навука, 2010.
44. Калечыц, А.Г. Чалавек і асяроддзе: каменны век, Заходняе Палессе / А. Г. Калечыц. — Мінск: Беларуская навука, 2018. — 584 с.
45. Каробушкіна Т.М. Насельніцтва Беларускага Пабужжа X–XIII стст. Мн., 1999.
46. Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI - XIX стст. Мн., 1984.
47. Квятковская А. Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVII вв.). Вильнюс, 1998.
48. Клейн Л.С. Археологическая типология. Ленинград, 1991.
49. Клейн Л.С. Археологические источники. Л. 1978.
50. Клейн, Л.С. Принципы археологии / Л.С. Клейн. — СПб.: Бельведер, 2001. — 152 с.
51. Колосов, А. В. Финальный палеолит и мезолит Посожья / А. В. Колосов. — Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. – 176 с.
52. Копытин В.Ф. Памятники финального палеолита и мезолита Верхнего Поднепровья. Могилев, 1992.
53. Кулик Н.А., Постнов А.В. Геология, петрография и минералогия в археологических исследованиях: Учебн.-метод. пособие / Новосиб. гос. ун-т, Ин-т археол. и этногр. СО РАН. Новосибирск, 2009. 102 с.
54. Кухаренко Ю.В. Зарубинецкая культура // САИ. 1964. Вып. Д1-19.
55. Кухаренко Ю. В. Могильник Брест-Тришин / Ю. В.Кухаренко. – Москва: Наука, 1980. – 130 с.
56. Краўцэвіч А. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV—XVIII ст. (планіроўка, культурны слой). Мн., 1991.
57. Крывальцэвіч, М.М. Азярное-1 – паселішча эпохі бронзы на поўначы Палесся. – Мн.: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 1999.
58. Крывальцэвіч, М.М. Могільнік сярэдзіны III–II тыс. да н.э. на Верхнім Дняпры – Прорва-1. – Мінск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2006.
59. Ксензов В. П. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья. Мн., 1988.
60. Ксензов В.П. Мезолит Северной и Центральной Беларуси // МАБ, 13. Мн., 2006.
61. Кузьмин Я.В. Геоархеология: естественнонаучные методы в археологических исследованиях. – Томск: Издательский Дом Томского государственного университета, 2017. – 396 с.
62. Лакіза В.Л. Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В.Л. Лакіза. – Мінск: “Беларуская навука”, 2008. – 343 с.
63. Левко О.Н. Витебск / О.Н.Левко; Нац. акад. наук Беларуси, Институт истории. – Минск: Беларуская навука, 2010.
64. Левко О.Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси. Мн., 2004.

65. Лошенков М.И. Городища милоградской культуры на территории Беларуси. – Мн.: МФЦП, 2011. – 408 с.
66. Лысенко П.Ф. Берестье. Мн., 1985.
67. Лысенко П.Ф. Города Туровской земли. Мн., 1974.
68. Лысенко П.Ф. Древний Туров. Мн., 2004.
69. Лысенко П.Ф. Дреговичи. Мн., 1991.
70. Лысенко П.Ф. Туровская земля IX–XIII вв. Мн., 1999.
71. Лысенко С. Д. Тштинецкий культурный круг и проблемы перехода к раннему железному веку в Северной Украине // Российский археологический ежегодник. – № 2. 2012. – С. 263–275.
72. Макушников О.А. Гомельское Поднепровье в V – середине XIII вв.: социально-экономическое и этнокультурное развитие. – Гомель, 2009.
73. Медведев А.М. Верхнее Понеманье в железном веке и раннем средневековье / А.М.Медведев. – Минск: Беларус. навука, 2011. – 350 с.
74. Мельниковская О.Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. М., 1967.
75. Минское Замчище: Материалы исследований Северо-восточной части в 2009 году (участок 1, раскопы 1, 2) / А.М. Медведев, И.В. Ганецкая, А.В. Войтехович, В.И. Кошман, Н.А. Плавинский, С.Д. Дернович / Материалы по археологии Беларуси. – Мн., 2011– Вып. 22.
76. Митрофанов А.Г. Железный век средней Белоруссии. Мн., 1978.
77. Плавінскі М.А. Курганны магільнік Пагошча ў кантэксце сінхронных старажытнасцяў Браслаўскага Паазер'я. – Мн., 2017.
78. Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке. – Минск: Беларус. навука, 2012.
79. Русанова И.П. Славянские древности VI – VII вв. Культура пражского типа. М., 1976.
80. Русов П. А. Деревянные сооружения Менска XIII—XVII вв. — Минск, 1992.
81. Седов В.В. Восточные славяне в VI—XIII вв. // Археология СССР. М., 1982.
82. Седов В.В. Славяне в древности. М., 1994.
83. Славяне на территории Беларуси в догосударственный период. В 2 Кн. / О.Н. Левко [и др.]; – Минск: Беларус. Навука, 2016 (2019).
84. Терпиловский Р.В., Абашина Н.С. Памятники киевской культуры. – Киев: Наук. думка, 1992. – 222 с.
85. Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII ст. Мн., 1978.
86. Ткачоў М.А. Замкі Беларусі. Мн., 1977.
87. Труды VI Международного Конгресса славянской археологии. Т. 3: Этногенез и этнокультурные контакты славян. – Москва, 1997.

88. Трусаў А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі. - Мінск : Харвест, 2015.
89. Трусаў А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI—XVIII стагоддзяў. Гісторыя будаўнічай тэхнікі. Мн., 2001.
90. Чарняўскі М.М. Неаліт Беларускага Панямоння. Мн., 1979.
91. Чарняўскі М. М., Кудрашоў В. Я., Ліпніцкая В. Л. Старажытныя шахцёры на Росі. Мн., 1996.
92. Чарняўскі, М. М. Да пытання вылучэння прыпяцка-нёманскай ранненеалітычнай культуры // Гістарычна-археалагічны зборнік. — 2003. — № 18. — С. 25—33.
93. Чернявский М.М. Поселения северобелорусской культуры // Материалы и исследования по археологии России и Беларуси. Комплексное исследование и синхронизация культур эпохи неолита — ранней бронзы Днепровско-Двинского региона. Сборник статей. – Санкт-Петербург, 2012. – с. 160-177
94. Шадыра В.І. Беларускае Падзвінне (І тыс. н.э.). Мн.: ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”. 2006.
95. Шадыро В.И. Ранний железный век Северной Белоруссии. Мн., 1985.
96. Шмидт Е.А. Кривичи Смоленского Поднепровья и Подвинья: (в свете археологических данных). – Смоленск, 2012.
97. Шмидт Е.А. Племена верховьев Днепра до образования Древнерусского государства (VIII в. до н.э. – III в. н.э.). М., 1992.
98. Штыхаў Г.В. Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. Мн., 1992.
99. Штыхаў Г.В. Узнікненне Лагойска: гісторыка-археалагічны нарыс. - Мінск: Беларуская навука, 2015.
100. Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.). Мн., 1978.
101. Штыхов Г.В. Лукомль: археологический комплекс железного века и средневековья. — Мн., 2014.
102. Щукин М.Б. На рубеже эр: опыт ист.-археол. реконструкции полит. событий III в. до н. э. – I в. н. э. в Вост. и Центр. Европе. – СПб.: ФАРН, 1994.
103. Щукин М.Б. Готский путь: готы, Рим и черняховская культура. – СПб.: Филол. фак. Санкт-Петерб. гос. ун-та, 2005. – 575 с.
104. Чубур, А.А. Константин Михайлович Поликарпович: жизнь, открытия, ученики / А.А. Чубур. — Минск: Беларуская навука, 2009. — 216 с.; ил.